УДК 7.046.3

**Уладзімір КАРЭЛІН,**
**Мікалай МЕЛЬНІКАЎ**

# Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі (частка 7)

Разгледжана частка іканаграфічных сюжэтаў, якія даволі рэдка сустракаюцца ў храмах Беларусі – не больш, чым у трох выпадках. Прыводзяцца кароткія звесткі аб адлюстраваных святых, разглядаецца іканаграфія асобных твораў. Асноўная частка разгледжаных абразоў адносіцца да канца XIX – пачатку XX ст. і адпавядае іканаграфічнаму канону, калі святыя і пакутнікі прадстаўлены паасобна разам са сваімі атрыбутамі і прыладамі пакут. Частка абразоў, якія адносяцца да XVIII – пачатку XIX ст. створана пад уздзеяннем твораў заходнееўрапейскага і рускага мастацтва, аднак, нягледзячы на гэта, адрозніваецца кампазіцыйнай своеасаблівасцю.
*Ключавыя словы*: абраз, святыя пакутнікі, іканаграфія, атрыбуты

**Vladimir Karelin, Nikolaj Melnikov**
**Rare plots in the icon painting of Belarus (part 7)**

Some of the iconographic plots, which are quite rare in the temples of Belarus (no more than in three cases), are considered. Brief descriptions of the depicted saints, and the iconography of certain works are presented. The main part of the considered icons belongs to the end of the 19th – beginning of the 20th and conforms to the iconographic canon when saints and martyrs are represented separately together with their attributes and instruments of torture. Some of the icons relating to the 18th – early 19th century were created under the influence of Western European and Russian art, but in a different compositional originality.
*Keywords:* icon, the Holy martyrs, iconography, attributes

**Володимир Карелін, Микола Мельников**
**Рідкісні сюжети в білоруському іконописі (частина 7)**
Розглянуто деякі іконографічні сюжети, які досить рідко трапляються в церквах Білорусі – не більше ніж у трьох випадках. Наведено короткі відомості про зображених святих, розглянуто іконографію окремих творів. Основна частина розглянутих ікон належить до кінця XIX – початку XX ст. і відповідає іконографічному канону, коли святих і мучеників представляють окремо разом з їхніми атрибутами та знаряддями страждання. Частина ікон, які відносять до XVIII – початку XIX ст., створені під впливом творів західноєвропейського та російського мистецтва, проте їм притаманна композиційна своєрідність.
*Ключові слова:* ікона, священномученики, іконопис, атрибутика

У дадзеным паведамленні, як і ў папярэдніх [1, с. 335; 2, с. 486; 3, с. 152; 4, с. 95; 5, с. 109; 6, с. 175], разглядаюцца асаблівасці іканаграфіі асобных, рэдка сустракаемых на Беларусі абразоў, што былі зафіксаваны ў храмах Беларусі падчас апошніх экспедыцыйных даследаванняў. Прыводзяцца тэхнічныя дадзеныя абразоў, падаюцца кароткія звесткі аб персанажах згодна літаратурных крыніц

[6–12]. Дні шанавання святых прыводзяцца па грыгарыянскаму і юліянскаму каляндарах.

Сюжэт **“Уваскрэсенне дачкі Іяіра”** зафіксаваны ў трох храмах Беларусі і адлюстроўвае адно з цудаў Ісуса Хрыста. Згодна евангелляў Марка, Мацея і Лукі, да Хрыста звярнуўся старшыня сінагогі ў Гадарынскай краіне з просьбай вылечыць яго паміраючую дачку. Калі яны прыйшлі да дому Іяіра, дзяўчына ўжо памерла і яе рыхтавалі да пахавання. Аднак Ісус разам з бацькамі дзяўчыны і трыма вучнямі – Пятром Якавам і Янам – увайшоў у пакой, дзе ляжала памерлая, і ўваскрэсіў яе.

Гэты сюжэт адлюстраваны ў палотнах рускіх мастакоў, што з’явіліся пратографам для некаторых абразоў. Так, абраз з сабора ў г. Гродна (канец ХІХ ст., палатно, алей, 130×50) больш нагадвае па кампазіцыі твор В. Дз. Паленава, у той час як абраз з г. Орша Віцебскай вобл. (*іл. 1*) з’яўляецца дакладнай копіяй з карціны І. Я. Рэпіна. На абразе з г. Стаўбцы Мінскай вобл. (канец ХІХ ст., палатно, алей, 36×50) адлюстраваны момант непасрэднага ўваскрэсення: Хрыстос трымае за руку дзяўчынку, якая ўжо расплюшчыла вочы. Побач з ложкам знаходзіцца яе ўкленчаная маці.

Даволі рэдкім іканаграфічным сюжэтам для для Беларусі з’яўляецца **“Сабор (Дзень) Усіх Святых”** – хрысціянскае свята ў гонар памяці ўсіх шанаваных царквою святых, як кананізаваных, так і тых, хто застаўся невядомым пры



*Іл. 1. Уваскрэсенне дачкі Іяіра. Г. Орша Віцебскай вобл., канец ХІХ ст., палатно, алей, 130×190)*

жыцці. У праваслаўнай царкве Дзень Усіх Святых (ці Нядзелю Ўсіх Святых) святкуюць у першую нядзелю пасля Пяцідзесятніцы, гэта значыць у восьмую нядзелю пасля Вялікадня. У каталіцкай царкве Дзень усіх святых адзначаецца 1 лістапада.

Найбольш прадстаўнічы абраз с гэтым сюжэтам зафіксаваны ў царкве Нараджэння Маці Божай в. Охава Пінскага раёна Брэсцкай вобл. (*іл. 2*). На вялікі жаль, захавалася толькі фотафіксацыя, паколькі сам абраз быў скрадзены і яго далейшы лёс невядомы. Кампазіцыя абраза падзелена на тры ўзроўні. Зверху, на воблаках, змешчана выява Святой Тройцы. Крыху ніжэй, з левага боку прадстаўлены ўкленчаная ў малітоўнай позе Маці Божая і жонкі-міраносіцы за яе спіной. З правага боку знаходзіцца таксама ўкленчаны Іаан Прадцеча, аб чым сведчыць надпіс над яго галавой, разам з апосталамі, з якіх вылучаецца апостал Пётр з ключамі ў левай руцэ. У сярэднім ярусе, з правага боку, на пярэднім плане сядзяць цар Давід з гуслямі і прарок Маісей са скрыжалямі запавету. Паміж імі, верагодна, знаходзіцца першасвятар Аарон. З левага боку прадстаўлены пакутніцы-хрысціянкі з кветкавымі вянкамі на галовах, сярод якіх па атрыбутах можна вызнаць св. Варвару і св. Кацярыну. У ніжнім ярусе, з левага боку абраза, на пярэднім плане, сядзяць царкоўныя іерархі, звычайна гэта праайцы царквы. З правага боку знаходзіцца група святых у манаскім аблачэнні, а пасяродку – двое старцаў з доўгімі сівымі валасамі і бародамі амаль да зямлі. Паміж першым і другім ярусамі змешчаны надпіс з назвай абраза: “Изображение иконы во имя пресвятой Тройцы собор всех святых”, а ў самым нізе абраза – яшчэ адзін вялікі надпіс (абодва надпісы падаюцца ў сучаснай транскрыпцыі), з якога вынікае, што “Во славу и честь Животворящей и неразделимой Тройцы сооружена сия икона рабами Божьими от российских войск корнетом Семеном Морозовым, генеральным писарем Калекским и вахмистром Григорием в Пинский Богоявленский Братский монастырь 1797 года января 1 дня”.

**Хрысціянскі святы Прападобнапакутнік Андрэй Крыцкі** нарадзіўся ў першай палове VIII ст. на Крыце. Ён вёў манаскае жыццё ў Кастроне і прыняў пакутніцкую смерць падчас ганенняў на хрысціян імператара Канстанціна Капроніма, якога святы абвінаваціў у ерасі. За гэта Андрэй Крыцкі быў схоплены, прыняў пакуты і загінуў па дарозе да месца пакарання. Гэта адбылося недзе ў 760 г. Яго памяць адзначаецца ў праваслаўнай царкве 30 (17) кастрычніка, у каталіцкай царкве 20 кастрычніка.

У храме в. Акцябр Кобрынскага раёна Брэсцкай вобл. знаходзіцца абраз з роставай выявай Андрэя Крыцкага (*іл. 3*) у манаскім аблачэнні. У левай руцэ ён трымае абраз Маці Божай Адзігітрыі. У ніжняй частцы абраза змешчаны надпіс, частка якога закрыта рамай: “Жертва Крестьѧнъ въ благодарное воспоминаніе о бывшемъ Епископѣ Костромскомъ Александрѣ […]”. Гэты абраз ужо разглядаўся намі раней [1], аднак узнікае пытанне – якім чынам вобраз Андрэя Крыцкага звязаны з асобай епіскапа Кастрамскога Аляксандра?

З літаратурных крыніц вядома, што епіскап Кастрамскі і Галіцкі (у міры Андрэй Іванавіч Кульчыцкі) нарадзіўся ў 1826 г. у в. Камень Шляхецкі (былая назва в. Ак-



*Іл. 2. Сабор (Дзень) Усіх Святых. Пінскі раён Брэсцкай вобл., 1797 г., дошка, тэмпера, 83×56*




*Іл. 3. Прападобнапакутнік Андрэй Крыцкі. Кобрынскі раён Брэсцкай вобл., канец XIX ст., палатно, алей, 120×53*

цябр) Кобрынскага уезда Гродзенскай губерні. У 1847 г. ён скончыў Літоўскую духоўную семінарыю і ў тым жа годзе рукапакладзены святаром Кобрынскай Петрапаўлаўскай царквы. Пасля смерці жонкі прыняў манаства ў 1852 г., у 1857 г. скончыў Санкт-Пецярбургскую духоўную акадэмію; памёр у 1888 г. у Кастраме. Адсюль вынікае, што абраз прападобнапакутніка Андрэя Крыцкага створаны вернікамі ў гонар свайго знакамітага земляка Андрэя Кульчыцкага.

**Прападобны Феадосій Татэмскі (Суморын)** шануецца як праваслаўны святы. Ён нарадзіўся каля 1530 г. у г. Волагдзе. Пасля смерці бацькоў і жонкі стаў манахам Валагодскага Праабражэнскага манастыра. У 1554 г. Феадосій заснаваў Татэмскі манастыр, а ў 1560 г. аднавіў Спаса-Нікольскую Яфрэмаву пустынь. Ён вёў аскетніцкі вобраз жыцця, патаемна насіў жалезныя вярыгі і жорсткую валасяніцу. Памёр Феадосій Татэмскі 28 студзеня 1568 г. у Татэмскім Спаса-Суморыным манастыры, дзе зараз і знаходзяцца яго мошчы. Праслаўлены ў ліку прападобнага 28 студзеня (8 лютага) 1798 г., дні шанавання – 28 студзеня (10 лютага) і 2 (15) верасня.

Адзіны абраз з выявай святога (*іл. 4*) захоўваецца ў калекцыі Музея старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі. Прападобны стаіць на фоне заснаванага ім Татэмскага манастыра, яго позірк скіраваны ў левы верхні вугал, дзе знаходзіцца выява абраза Маці Божай Адзігітрыі, які Феадосій атрымаў ад Валагодскага манастыра як блаславенне на заснаванне Татэмскай абіцелі і які цяпер вядомы пад назвай Маці Божай Суморынскай.

**Агнэса Рымская**, самая маладая хрысціянская пакутніца, нарадзілася, згодна падання, каля 291 г. у Рыме ў знатнай хрысціянскай сям'і. Ужо ў раннім узросце яна вырашыла не браць шлюбу і цалкам прысвяціць сябе Богу. Таму Агнэса адмовіла сыну рымскага прэфекта, за што была прызначана на здзекі і пакуты, аднак цудадзейным чынам засталася цэлай і нявіннай. Агнэсу, як вядзьмарку, вырашылі спаліць на вогнішчы, але полымя згасла, і тады адзін з салдат адсек ёй галаву. Адбылося гэта 21 снежня 304 г., калі Агнэсе было 12 гадоў. Дзень памяці святой пакутніцы адзначаецца ў каталіцкай царкве 21 снежня, у праваслаўнай царкве 21 снежня і 5 ліпеня (па юліянскім календары). Яна з'яўляецца сімвалам духоўнай чысціні, яе атрыбуты – белы агнец, як сімвал Хрыста, і пальмавая сцябліна. Абраз св. Агнэсы зафіксаваны толькі ў Мядзельскім раёне Мінскай вобл. (*іл. 5*). У авальнай раме змешчана пакаленная выява святой у белай сукенцы і блакітнай накідцы, з вохрыстай хусцінай на галаве. Агнэса з замілаваннем глядзіць на агнца, які ляжыць перад ёй на пастаменце.

Праваслаўная святая **Пакутніца Аляксандра** – царыца і жонка імператара Дыёклетыяна, ганіцеля хрысціянства. Уражаная стойкасцю і мужнасцю воіна-хрысціяніна св. Юрыя, які абвінаваціў імператара ў бясчынствах супраць хрысціян, св. Аляксандра паверыла ў Хрыста і адкрыта выказвала сваю веру. За гэта ёй разам са св. Юрыем імператар вынес смяротны прысуд. Па дарозе да месца пакарання Аляксандра спынілася для адпачынку і ціха памерла. Гэта адбылося 21 красавіка 303 г. у Нікадзіміі, аднак памінанне святой праводзіцца 23 красавіка, разам са святам вялікапакутніка Юрыя.



*Іл. 4. Прападобны Феадосій Татэмскі (Суморын). XIX ст., дошка, алей, 17×13*



*Іл. 5. Агнэса Рымская. Мядзельскі раён Мінскай вобл., канец XVIII ст., палатно, алей, 80×60*

На абразах пакутніца Аляксандра звычайна падаецца ў царскім аблачэнні, з каронай на галаве, як на творы з Валожынскага раёна Мінскай вобл (*іл. 6*). На іншых абразах з роставай выявай св. Аляксандры яна трымае ў руцэ крыж, а на абразе з г. Ракаў Валожынскага раёна Мінскай вобл. (XIX ст., палатно, алей, 107×71) правай рукой абапіраецца на меч, а ў левай трымае пальмавую сцябліну.



*Іл. 6. Пакутніца Аляксандра. Валожынскі раён Мінскай вобл., XIX ст., палатно, алей, 43×80*

Праваслаўная святая **Блажэнная царыца Феафанія** таксама была царыцай і першай жонкай імператара Ільва VI Мудрага. Па абгавору правяла разам з мужам (тады яшчэ наследнікам прэстолу) тры гады пад хатнім арыштам. Стаўшы царыцай, вяла праведнае жыццё ў малітвах і цялесных абмежаваннях. Апошнія гады жыла ў манастыры, не прымаючы пострыгу. Памерла Феафанія ў 893 ці 894 г. Адразу пасля смерці яна праславілася цудамі і неўзабаве была кананізавана.

На абразе, зафіксаваным толькі ў Вілейскім раёне Мінскай вобл. (*іл 7*), прадстаўлена паясная выява святой у царскім аблачэнні, з укрыжаваннем і пальмавай сцяблінай у руках.

Амаль усе прадстаўленыя выявы святых і пакутнікаў адпавядаюць іканаграфічнаму канону, аднак некаторыя вылучаюцца сваімі іканаграфічнымі асаблівасцямі і адметнымі подпісамі. Асобныя сюжэты створаны пад уплывам твораў рускага мастацтва і нават з'яўляюцца дакладнымі копіямі з карцін вядомых мастакоў.



*Іл. 7. Блажэнная царыца Феафанія. Вілейскі раён Мінскай вобл., другая палова XIX ст., дошка, алей, 65×48*

1. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі. *Історія релігій в Україні: наук. щоріч*. Львів, 2015. Кн. 2. С. 335–350.

2. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі (частка 2). *Історія релігій в Україні: наук. щоріч.* Львів, 2016. Ч. 2/3. С. 486–497.

3. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі. *Історія релігій в Україні: наук. щоріч*. Львів, 2017. Ч. 2. С. 152–163.

4. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканаграфіі святых у храмах Беларусі. *Історія релігій в Україні: наук. щоріч*. Львів, 2018. Ч. 2. С. 95–115.

5. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі (частка 5). *Історія релігій в Україні: актуальні питання*. Львів, 2019. С. 109–120.

6. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі (частка 6). *Історія релігій в Україні: актуальні питання*. Львів, 2020. С. 175–182.

7. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2002. Т. 1. 1906 с.

8. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2005. Т. 2. 1818 с.

9. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2007. Т. 3. 1910 с.

10. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2011. Т. 4. 1962 с.

11. Православная энциклопедия. Москва, 2000. Т. 1. 752 с.